# *СВЯТКАВАННЕ КАЛЯД*

Протасевич Анита
6 клас

**КАЛЯ́ДЫ** — НАРОДНАЕ ЗІМОВАЕ СВЯТА ДАХРЫСЦІЯНСКАГА ПАХОДЖАННЯ. ПРАЦЯГВАЮЦЦА ДВАНАЦЦАЦЬ ДЗЁН З 24 СНЕЖНЯ (6 СТУДЗЕНЯ) ПА 6 (19) СТУДЗЕНЯ — З КАЛЯДЫ ДА ВАДОХРЫШЧА.

У ГАДАВЫМ КОЛЕ НАРОДНЫХ ЗЕМЛЯРОБЧЫХ АБРАДАЎ І СВЯТ ЗАЙМАЛА 1-Е МЕСЦА. З УСТАЛЯВАННЕМ ХРЫСЦІЯНСТВА ПРЫМЕРКАВАНА ДА РЭЛІГІЙНЫХ СВЯТ НАРАДЖЭННЕ ХРЫСТОВА І ХРЫШЧЭННЕ ГАСПОДНЯЕ.

НА БЕЛАРУСІ ХРЫСЦІЯНСКАЯ АБРАДНАСЦЬ СВЯТКАВАННЯ КАЛЯД ШЧЫЛЬНА ПЕРАПЛЕЦЕНА З НАРОДНЫМІ СВЯТОЧНЫМІ ЗВЫЧАЯМІ.

ДЛЯ КАЛЯД ХАРАКТЭРНЫ ТРЫ АБРАДАВЫЯ ВЯЧЭРЫ (КУЦЦІ): ПОСНАЯ (ВЯЛІКАЯ) СПРАЎЛЯЕЦЦА ПЕРАД 1-М СВЯТОЧНЫМ ДНЁМ, БАГАТАЯ (ТОЎСТАЯ, ШЧОДРАЯ) З МЯСНЫМІ СТРАВАМІ — У ШЧОДРЫ ВЕЧАР (ВЕЧАР ПЕРАД НОВЫМ ГОДАМ), ПОСНАЯ (ГАЛОДНАЯ, ВАДЗЯНАЯ) — ПЕРАД ВАДОХРЫШЧАМ. НАЛАДЖВАЛІСЯ КАЛЯДАВАННЕ, ВАРАЖБА, ШМАТЛІКІЯ ЗАБАВЫ, ГУЛЬНІ; СПЯВАЛІ КАЛЯДНЫЯ ПЕСНІ.

У ГАДАВЫМ КОЛЕ КАЛЯДЫ СУПРАЦЬСТАЯЦЬ КУПАЛЛЮ, ЯКОЕ СВЯТКАВАЛАСЯ БЛІЗКА ДА ЛЕТНЯГА СОНЦАСТАЯННЯ.


Anisia Vishnevskaya-2008


БЕЛАРУСКІ

**КАЛЯДЫ** – АДНО З САМЫХ МІСТЫЧНЫХ СВЯТАЎ У СТАРАЖЫТНЫХ СЛАВЯН. ЯНО МЕНШ ЗВЯЗАНА З СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫМ ЦЫКЛАМ, А БОЛЬШ З БУДОВАЙ І РУХАМ СУСВЕТУ. ПЕРШЫ ДЗЕНЬ КАЛЯДАЎ – ДЗЕНЬ, У ЯКІ ДАЎЖЫНЯ СВЕТЛАВОГА ДНЯ ПАЧЫНАЛА ПАВЯЛІЧВАЦЦА ПАСЛЯ ЗІМОВАГА СОНЦАСТАЯННЯ, ЗВЫЧАЙНА ПРЫХОДЗІЎСЯ НА 23-24 СНЕЖНЯ ПА СУЧАСНЫМ СТЫЛІ, ЛІЧЫЎСЯ ПАЧАТКАМ АСТРАНАМІЧНАГА НОВАГА ГОДА. У АДРОЗНЕННІ АД СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАГА НОВАГА ГОДА, КАТОРЫ З' ЯЎЛЯЎСЯ ПАЧАТКАМ ПРАЦЫ Ў ПОЛІ, НА КАЛЯДЫ «НАРАДЖАЛАСЯ НОВАЕ СОНЦА», ЧАС «ПАВАРОЧВАЎСЯ НА ВЯСНУ». НОВАЕ СОНЦА ЎВАСАБЛЯЛАСЯ Ў ВОБРАЗЕ ДЗІЦЯЦІ, ВЫКРАДЗЕНАГА ЛЮТАЙ ВЯДЗЬМАРКАЙ ЗІМОЮ, КАТОРАЯ ПЕРАТВАРЫЛА ЯГО Ў ВАЎКА. АЛЕ СВЕТЛЫЯ СІЛЫ, ВЯДОМА, ПЕРАМАГАЮЦЬ, ГАРАЧЫЯ ПРОМНІ МАЛАДОГА СОНЦА СПАЛЬВАЮЦЬ ВАЎЧЫНУЮ СКУРУ, ЯНО ВЫЗВАЛЯЕЦЦА З ПАЛОНУ ЦЁМНЫХ СІЛ І ПАКРЫСЕ «СТАЛЕЕ», З КОЖНЫМ ДНЁМ НАБІРАЮЧЫ СІЛ ДА ВЯСНЫ.

# Ад чаго паходзіць слова каляды

САМО СЛОВА «КАЛЯДЫ» МАЕ ПАХОДЖАННЕ АД ЛАЦІНСКАГА CALENDAE, «КАЛЕНДЫ» — НАЗВА ПЕРШАГА ДНЯ КОЖНАГА МЕСЯЦА (АД ТАГО КОРАНЯ ПАЙШОЎ І «КАЛЯНДАР»), А ТАК САМА АД СТАРАЖЫТНАЙ НАЗВЫ СОНЕЧНАГА ДЫСКУ – КОЛА.

# Калядныя песні

НА ДВАРЫ ЧОРНА ХМАРА ЎЕЦЦА

НА ДВАРЫ ЧОРНА ХМАРА ЎЕЦЦА,
ПАД ВАКНОМ КАЛЯДНІК ЧАЎПЕЦЦА.
КЛІЧЦЕ ЯГО У ХАТУ,
ЁН ВАМ БУДЗЕ СПЯВАЦІ КАЛЯДУ.

ПРЫПЕЎ: ЯМІН, ЯМІН, ЯМІН,
ЎЗВЕСЯЛІСЯ ДРУЖАНА ХРЫСТОВАЯ.

А Ў ПЕЧЫ ПІРАГІ СЯДЗЕЛІ,
ТАМ МАЕ ВОЧАНЬКІ ГЛЯДЗЕЛІ.
СЮТЫ-ТУДЫ ВЫГЛЯДАЎ,
ПА АДНОМУ ВЫЦЯГАЎ - НАЕЎСЯ!

ПРЫПЕЎ

ЯК Ў ПЕЧЫ ПІРАГОЎ НЕ СТАЛА,
ПАЛЕЗ Я НА ГАРУ ПА САЛА.
А Я САЛА НЕ ДАСТАЎ,
З ДРАБІНОЮ З ГАРЫ ЎПАЎ - ЗАБІЎСЯ!

**САЎКА ДЫ ГРЫШКА** САЎКА ДЫ ГРЫШКА ЛАДЗІЛІ ДУДУ - ПАВЕСЯЛІЦЦА ДЫ ПРАГНАЦЬ НУДУ. ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДЫ ПРАГНАЦЬ НУДУ. ЯК РАЗЫШЛІСЯ МУЗЫКІ Ў ГАР, ЗГІНУЛА ГОРА, ЗГІНУЛА ТУГА. У ХА ХА ХА У ХА ХА ХА У ХА ХА ХА ХА У ХА ХА ХА У ХА ХА ХА ЗГІНУЛА ТУГА. ДЗЯДОК СТАРЭНЬКІ, ЕМКІ ЎЗЯЎШЫ СКРУТ, КІЕМ НА ДЗЬВЕРЫ ПАКАЗАЎ ІМ ТУТ. ТУ ТУ ТУ ТУ ТУ ТУ ТУ ТУ ТУ ТУ ТУ ТУ ТУ ПАКАЗАЎ ІМ ТУТ. ВЫ САБЕ ДУЙЦЕ СВАЁ ГО-ЦА-ЦА, ТОЛЬКІ НЕ СТРАШЦЕ МАЛАГА ХЛАПЦА. ГО ЦА ЦА ЦА ГО ЦА ЦА ЦА ГО ЦА ЦА ЦА ЦА ГО ЦА ГО ЦА МАЛАГА ХЛАПЦА. САЎКА ДЫ ГРЫШКА ЛАДЗІЛІ ДУДУ - ПАВЕСЯЛІЦЦА ДЫ ПРАГНАЦЬ НУДУ. ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДУ ДЫ ПРАГНАЦЬ НУДУ.

ДА КАЛЯД АБАВЯЗКОВА АДКАЗНА РЫХТАВАЛІСЯ. ПРЫБІРАЛІ ХАТУ, УБІРАЛІ ЯЕ САМАРОБНЫМІ ЎПРЫГОЖВАННЯМІ, РАБІЛІ, КАЛІ БЫЎ ПАТРЭБНЫ, РАМОНТ УСІХ ГАСПАДАРЧЫХ БУДЫНКАЎ НА ПАДВОР'І. ДА КАЛЯДАЎ СТАРАЛІСЯ ПАШЫЦЬ НОВАЕ АДЗЕННЕ, АБАВЯЗКОВА ПАМЫЦЦА Ў ЛАЗНІ. НОВЫ ГОД І НОВАЕ СОНЦА НЕПРЫГОЖА СУСТРАКАЦЬ, КАЛІ НЕПАРАДАК У ГАСПАДАРЦЫ ЦІ Ў ДУШЫ. ВОСЬ І ЗАРАЗ СТАРАЮЦЦА ЛЮДЗІ ДА НОВАГА ГОДА ДАРАБІЦЬ ПАЧАТЫЯ СПРАВЫ, РАЗЛІЧЫЦЦА З ПАЗЫКАМІ, ПРЫБРАЦЬ ЖЫЛЛЁ. А ВОСЬ ЗАМЕСТ ЗВЫЧАЙНАЙ У НАШЫЕ ЧАСЫ НАВАГОДНЯЙ ЯЛІНЫ АСНОЎНЫМ УПРЫГОЖАННЕМ ХАТЫ ТАГО ЧАСУ БЫЎ СНОП ЗБОЖЖА, ЯКІ УНОСІЛІ У ХАТУ Ў ПЕРШЫ ДЗЕНЬ КАЛЯД І ТРЫМАЛІ ТАМ ДА АПОШНЯГА. ЗАМЕСТ СНАПА МАГЛА БЫЦЬ І САЛАМЯНАЯ ЛЯЛЬКА, ЯКАЯ ЎЯЎЛЯЛА САБОЙ НОВАНАРОДЖАНЫ ГОД.

КАЛЯДЫ – СВЯТА ВЯСЁЛАЕ. АСАБЛІВЫ СВЯТОЧНЫ НАСТРОЙ СТВАРАЛА, МАБЫЦЬ, І ТОЕ, ШТО ДА ПАЧАТКУ РАБОТ У ПОЛІ – САМЫ ЦЯЖКІ ЧАС ДЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ – БЫЛО ЯШЧЭ ДАЛЁКА. НАВАТ БОЛЬШ – НА КАЛЯДЫ НЕЛЬГА БЫЛО РАБІЦЬ НІЯКУЮ ПРАЦУ, АНІ ТКАЦЬ, ПРАЦЬ, РЫХТАВАЦЬ ДРОВЫ – МОЖНА БЫЛО ТОЛЬКІ ВЕСЯЛІЦЦА, КАБ ПАДТРЫМАЦЬ СІЛЫ СВЯТЛА СВАІМ НАСТРОЕМ ДЫ ЗАДОРАМ. ПРАЦЯГВАЛІСЯ КАЛЯДЫ ПРЫКЛАДНА 2 ТЫДНІ, ДА ВЕЛЕСАВА ДНЯ, ЯКІ ПРЫХОДЗІЎСЯ НА 6-7 СТУДЗЕНЯ ПА СУЧАСНЫМ СТЫЛІ. АСАБЛІВАЕ МЕСЦА Ў СВЯТКАВАННІ КАЛЯД АДВОДЗІЛАСЯ АБРАДАВАМУ СТАЛУ І СВЯТОЧНЫМ СТРАВАМ. СТОЛ, ВЯДОМА, ПАВІНЕН БЫЦЬ БАГАТЫМ, КАБ НАСТУПНЫМ ГОДАМ МЕЦЬ ДОБРЫ ЎРАДЖАЙ І ЗДАРОЎЕ ДЗЕЛЯ ЛЮДЗЕЙ І ЖЫВЁЛ. ПАД АБРУС НА СТОЛ КЛАЛІ СЕНА, КАТОРАЕ ПАСЛЯ ВЯЧЭРЫ СКОРМЛІВАЛІ КАРОВАМ, ШТО ПАВІННА БЫЛО ЗБЕРАГЧЫ ІХ АД ВАЎКОЎ І ПАСПРЫЯЦЬ ПАВЕЛІЧЭННЮ НАДОЕЎ МАЛАКА. У КОЖНАЙ, НАВАТ САМАЙ БЕДНАЙ, ХАЦЕ НА КАЛЯДЫ ДАСТАВАЛІ З СХОВАНАК МЯСА ДЫ КАЎБАСЫ, САЛА, АРЭХІ, ЯБЛЫКІ, МЁД. АД ГАЛОЎНАЙ СТРАВЫ КАЛЯДАЎ – КУЦЦІ (ЯЧНЕВАЯ КАША З ДАБАЎЛЕННЕМ МЁДУ, АРЭХАЎ, ШКВАРАК) – УЗЯЛІ НАЗВУ ТРЫ АБАВЯЗКОВЫЯ СВЯТОЧНЫЯ ВЯЧЭРЫ. У ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ЛАДЗІЛАСЯ «ПОСНАЯ КУЦЦЯ» — НА СТАЛЕ БЫЛІ СТРАВЫ З РЫБЫ, ГАРОДНІНЫ, ГРЫБОЎ, СУШАНАЙ САДАВІНЫ, МЁДУ, І, КАНЕЧНЕ, ТАЯ САМАЯ ЯЧНЕВАЯ КАША-КУЦЦЯ З МЁДАМ. ВАРЫЛІ ЯЕ ТАКСАМА НЕЗВЫЧАЙНА, А ДРУГОЙ ГАДЗІНЕ НОЧЫ СТАРЭЙШАЯ ЖАНЧЫНА Ў СЯМ'І ІШЛА Ў СВІРАН ЗА ЗЕРНЕМ, А СТАРЭЙШЫ МУЖЧЫНА – ПА ВАДУ. ВАДУ І ЗЕРНЕ НЕЛЬГА БЫЛО ЧАПАЦЬ ДА ТАГО МОМАНТУ, ЯК БУДЗЕ ГАТОВА ПЕЧКА. НАРЫХТАВАНАЙ ТАКІМ ЧЫНАМ КУЦЦІ НАДАВАЛАСЯ АСАБЛІВАЕ МАГІЧНАЕ ЗНАЧЭННЕ, ЯНА ПАВІННА БЫЛА НАДАВАЦЬ УСІМ ЗДАРОЎЯ, МОЦЫ, УДАЧЫ. ПАЧЫНАЎ ВЯЧЭРУ, ЯК ЗВЫЧАЙНА, ГАСПАДАР, АКРАМЯ ТАГО ЗА СТОЛ ТАК ЦІ ІНАКШ ЗАПРАШАЛІСЯ ЎСЕ ПРОДКІ. РЭШТКІ КУЦЦІ ПАДКІДВАЛІ ПАД СТОЛЬ, КАБ ЯЧМЕНЬ НАСТУПНЫМ ГОДАМ УРАДЗІЎ ВЫСОКІ. ПАСЛЯ ГЭТАГА КРУПЫ СКОРМЛІВАЛІ ХАТНІМ ПТУШКАМ. НА АСОБНАЙ ТАЛЕРАЧЦЫ БЫЛА І КАША ДЗЕЛЯ ЗЮЗІ, ЗІМОВАГА БОГА, КАБ УЛАГОДЗІЦЬ ЯГО, БО МАРАЗЫ Ў ПЕРЫЯД КАЛЯД БЫЛІ, БАДАЙ, САМЫМІ МОЦНЫМІ ЗА ЎСЮ ЗІМУ. ГЭТЫ ДАВОЛІ РАСПАЎСЮДЖАНЫ ЗВЫЧАЙ ЗАХАВАЎСЯ Ў НЕКАТОРЫХ КРАІНАХ І ПА СЁННЯШНІ ДЗЕНЬ — ТРАДЫЦЫЯ СТАВІЦЬ НА НОВЫ ГОД ЗА АКНО ТАЛЕРАЧКІ З ЗЕРНЕМ.

ДРУГАЯ КУЦЦЯ, ТОЎСТАЯ, БАГАТАЯ, ШЧОДРАЯ – ЛАДЗІЛАСЯ ПРАЗ ТЫДЗЕНЬ, ПА ЧАСУ СУПАДАЛА З СУЧАСНЫМ НОВЫМ ГОДАМ. ЯК ВЫНІКАЕ З НАЗВЫ, У ГЭТЫ ВЕЧАР НА СТАЛЕ БЫЛІ СТРАВЫ З МЯСА РАЗНАСТАЙНЫХ ГАТУНКАЎ – ВАРАНАГА, СМАЖАНАГА, ПЕЧАНАГА, КАЎБАСЫ, ВЯНДЛІНЫ, КУЦЦЯ СА ШКВАРКАМІ.
ТРЭЦЯЯ КУЦЦЯ ПРЫХОДЗІЛАСЯ НА КАНЕЦ СВЯТОЧНАГА ТЫДНЯ, ВЕЛЕСАЎ ДЗЕНЬ, ЗВЫЧАЙНА 6 СТУДЗЕНЯ ПА СУЧАСНЫМ СТЫЛІ І НАЗЫВАЛАСЯ “ВАДЗЯНАЯ”. МАГЧЫМА, ТАКУЮ НАЗВУ ЯНА АТРЫМАЛА ПАЗНЕЙ, УЖО Ў ХРЫСЦІЯНСКІЯ ЧАСЫ, ТАМУ ШТО СУПАДАЛА З ЦАРКОЎНЫМ СВЯТАМ ВАДОХРЫШЧА. АЛЕ ЁСЦЬ ВЕРАГОДНАСЦЬ, ШТО ЗА ДВА ТЫДНІ СВЯТКАВАННЯ ДЫ НАБІВАННЯ СТРАЎНІКАЎ, ЗАПАСЫ ЗНАЧНА ПАМЯНШАЛІСЯ І КАША НА ВАДЗЕ – БАДАЙ, АДЗІНАЕ, ЧЫМ МОЖНА БЫЛО ЧАСТАВАЦЬ ГАСЦЕЙ ПАД КАНЕЦ КАЛЯД.
НЕМАГЧЫМА ЎЯВІЦЬ САБЕ КАЛЯДЫ БЕЗ МІСТРЭРЫІ. ЯНА ПАЧЫНАЛАСЯ Ў ПЕРШЫ Ж ДЗЕНЬ І СКОНЧВАЛАСЯ АПОШНІМ. У ЧАС ЗІМОВАГА СОНЦАСТАЯННЯ, ЯК І АСТАТНІЯ ТАКІЯ Ж ДАТЫ, ДЗЕЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ АДЧЫНЯЛІСЯ ДЗВЕРЫ ПАМІЖ СВЕТАМ ІСНАСЦІ І МРОІ, ЖЫВЫХ І ПАМЕРЛЫХ, УСЁ БЫЛО ПРАСЯКНУТА ЧАРОЎНЫМ І НЕБЯСПЕЧНЫМ ДУХАМ ТАЯМНІЦЫ. ЧАС ЛІЧЫЎСЯ СПРЫЯЛЬНЫМ ДЗЕЛЯ ВЕДЗЬМАРОЎ ДЫ НЯЧЫСЦІКАЎ,ШТО НАСЫЛАЛІ НА ЗЯМЛЮ ТРАСКУЧЫЯ МАРАЗЫ, АЛЕ Ж ТАКСАМА І ДЗЕЛЯ ВАРАЖБЫ, ЗАКЛЁНАЎ ДЫ АБЯРЭГАЎ. ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ ГЭТАЕ СПРАДВЕЧНАЕ СВЯТА І ДА СЁННЯШНЯГА ДНЯ ЗАЎЖДЫ ЗАСТАЕЦЦА РАДАСНЫМ, ВЕЛІЧНЫМ І АПТЫМІСТЫЧНЫМ.

# ДЗЯКУЙ ЗА УВАГУ